ВЕДАЙ НАШЫХ!

# ВОБРАЗЫ Ў БРОНЗЕ І КАМЕНІ

Кульмінацыяй рэспубліканскага фестывалю-кірмашу "Дажынкі-2005" стала ўзнагароджанне лепшых з лепшых сельскіх працаўнікоў краіны. У праграме знаходжання Аляксандра Лукашэнкі ў Слуцку было і ўскладанне кветак да памятнага знака воінам і партызанам, якія вызвалялі горад у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Гэты момант можна было б і без увагі пакінуць – кіраўнік краіны наведваў і больш грандыёзныя архітэктурныя і скульптурныя збудаванні, аддаваў даніну павагі абаронцам Айчыны многа разоў, каб не наступны факт: адным з аўтараў скульптурнай кампазіцыі з'яўляецца наш зямляк, вядомы ў Беларусі скульптар Уладзімір Церабун. І хаця апошнім часам жыве Уладзімір Васільевіч у Мінску, сувязі з малой радзімай не парывае. Больш таго, шэраг апошніх работ у бронзе і камені былі ўстаноўлены ў Смаргоні да 500-годдзя горада.



- Слуцкі "варыянт", - распавядае Уладзімір Церабун, - работа двух аўтараў - сталічнага скульптара Аляксандра Крахалёва і мая. Яна ўяўляе сабой фігуратыўную кампазіцыю воіна-вызваліцеля ў момант атакі. Магутнасць, выразнасць, дынамізм, за якімі ўрэшце стаіць перамога, вызначаюць галоўную ідэю помніка. А яшчэ гэта – нібы праекцыя ў дзень сённяшні: менавіта такой дынамічнай, скіраванай на перамогу ўяўляецца мне наша Беларусь.

У мастака нямала творчых задум. Уладзімір Церабун не згубіў надзею ўбачыць у горадзе распрацаваную ім скульптурную кампазіцыю "Мядзведжая акадэмія". А бліжэйшая з іх - арганізаваць у Смаргоні творчую выставу, прымеркаваную да свайго 60-гадовага юбілею.

**Алесь САВІЦКІ.**

**НА ЗДЫМКУ: фрагмент памятнага знака на "Алеі Славы" ў горадзе Слуцку.**

**Фота з архіва У. ЦЕРАБУНА.**